ў Пуцівелцаў дзеканьня) ў 3 ас. адз. ліку цяпер. часу як із націскам, так і бяз націску на канцу (*гукаіть, кажыть, пяеть*). Абедзьве гэтыя рысы паказуюць, што пуцівельска–беларуская гаворка належа да ўсходняга чарасла сярэдняга дыялекту беларускае мовы. Захаваньням званчыні сугукаў на канцу слова, большай чымся ў іншых гаворках беларускіх, гэтая гаворка стаіць у беспасярэдняй сувязі із северска–беларускімі гаворкамі.

Можна было–б думаць, што менаваны тып дысыміляцыйнага аканьня па мяккіх сугуках зьявіўся ў усходнім чарасьле сярэдняга дыялекту не органічна, але пад уплывам дысыміляцыйна–акаючага, паўночнага — пляменна–крывіцкага — нарэчча, з каторым сярэдні дыялект сваім усходнім чараслом мяжуе. Быццё, адылі, гэтага тыпу аканьня ў пуцівельскай гаворцы, тэрыторыяльна далёкай ад паўночнага нарэчча, вылучае такую магчымасьць, іншымі словамі, менаваны тып дысыміляцыйнага аканьня па мяккіх сугуках узьнік у усходнім чарасьле сярэдняга дыялекту незалежна ад якіх–колечы ўплываў. Гэткім парадкам дзякуючы пуцівельскай гаворцы разьвязуецца адна проблема ў ваканьню, і развой дысыміляцыйнасьці ў ім робіцца нам ясьнейшы[5].

# Што было ў жніўню ў гісторыі Крывіч

**25 жн. 1078** — Вялікі Князь Северска–Беларускі Алег перамог на Сожыцы ў Севершчыне Ўсевалада Яраславіча, вывальняючы гэтым Севершчыну ад Кіева.

**1 жн. 1115** — сьмерць Алега Северскага

**8 жн. 1136** — перамога Севяран на чале з кн. Усеваладам Вольгавічам над Украінцамі ля Пераяслаўля.

**1 жн. 1146** — сьмерць Усевалада Вольгавіча, выдатнага Северска–Беларускага князя.

**7 жн. 1250** — Вялікі Князь Крывіцкі (Літоўскі) Міндоўг выдаў ліст, каторым падарыў Крыжаком усю Жмудзь — адну зь дзьвюх часьцяў цяперашняе Лятувы.

**Жнівень 1385** — паход Крыжакаў на Крывічы, дайшлі яны аж пад Ашмяну.

**15 жн. 1385** — падпісаньне Краўское ўмовы з Польшчаю.

**4 жн. 1392** — умова ў Войстраве Ягайлы зь Вітаўтам, подле якое Вітаўт станавіўся Вял. Князям Літоўскім (Беларускім).

**12 жн. 1399** — бітва ля Ворсклы.

**15 жн. 1409** — Крыжацкі ордэн абясьціў вайну Крывічом а Польшчы.

**3 жн. 1422** — умова Вялікага Князя Крывіцкага Вітаўта зь Цьверскім князям Барысом, якою гэты абавязаўся „быць із Літвою за адзін“ супроць усіх варагоў. Умова была сьціраваная супроць Масквы.

**15 жн. 1430** — першы вызначаны рок каранаваньня Вітаўта за караля.

**2 пал. жн. 1431** — выступілі вайною супроць Польшчы хаўрусьнікі Крывіч (за Вял. Кн. Сьвідрыгайлы) вайвода Валоскі а Крыжакі.

# Траґедыя зь нясьведамасьці

**(Зь гісторыі Беларусі XIX—XX стагодзьдзяў)**

Напісаны гэты артыкул пад даймом павесьці Флярыяна Чарнышэвіча „Nadberezyńcy“, напісанай папольску, выданай у 1942 г. Галоўныя падзеі апісаныя ў гэтай павесьці,

[5] Аўтар непрапорцыянальна доўга задзержыўся над беларускімі Пуцівелцамі, асабліва над іхнай гаворкаю, бо гэты найдалей на паўдня высунены куток беларускае этноґрафічнае тэрыторыі надта мала знаны адумыслоўцам, а не адумыслоўцы пра яго сусім ня ведаюць; а мусіўшы драбязна разглядаць пуцівельска–беларускую гаворку, хацелася высіліць матар'ял, каб не варочацца да яе ў працы моўнай.